# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

ISSN 1993-1999

9
2025



# ЗМЕСТ

**2025 — год**
**ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ**

*Да Дня народнага адзінства*


ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Вольга Бароўская** **“Місія Іосіфа Атоцкага” (верасень 1922 г. — люты 1923 г.)** 3

ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ

**Аляксандр Горны** **Сяргей Паўловіч (1875—1940): старонкі жыцця і дзейнасці** 7

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Юлія Кейко** **Гісторыя ўзвядзення будынка Гродзенскай жаночай гімназіі (1892—1894 гг.)** 15

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ.

**Ирина Бочило, Наталья Леонова** **Западная Беларусь в составе Польши** *(история Беларуси, IX класс)* 20

МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА

**Юлія Захарына** **Прыродны свет вачыма Вітольда Бялыніцкага-Бірулі: прасторавыя загадкі і патаемныя сэнсы** 26

КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

**Святлана Талмачова** **“Памятные книжки...” губерняў як крыніца па вывучэнні інстытута міравых пасрэднікаў на тэрыторыі Беларусі (1861—1903 гг.)** 33

ГІСТОРЫЯ АДУКАЦЫІ

**Аляксандр Кушнярэвіч** **Навукова-адукацыйныя кантакты ВКЛ і германскіх земляў у XV—XVIII стст.** 40

АДУКАЦЫЯ XXI СТАГОДДЗЯ

**Ольга Стрелова** **Хасанские события июля — августа 1938 г.: критический анализ источников** 45

**Галина Давидовская** **Конструирование ситуационных задач для формирования функциональной грамотности учащихся на уроках истории** 54

МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЎРОКАЎ

**Александр Корзюк, Игорь Гродзицкий** **Тесты по учебному предмету “История Беларуси в контексте всемирной истории”** 62

**Содержание/Summary** 71


*У нумары выкарыстаны фота з адкрытых крыніц.*


***Да ведама аўтараў.*** *Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, давядзенне да ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса), а таксама на рэдагаванне і скарачэнне матэрыялу па меркаванні рэдакцыі. Папярэджваем аб праваВой абароне аўтарскіх правоў на змешчаныя матэрыялы. Перадрук магчымы толькі з дазволу рэдакцыі з абавязковай спасылкай на “Беларускі гістарычны часопіс”.*

УДК 94(476)

**Аляксандр ГОРНЫ**

*Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік Цэнтра даследавання дыяспар і замежнага беларусазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.*

*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху, палітычная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, гісторыя беларускай дыяспары, гісторыя Праваслаўнай царквы ў XX ст.*

*Аўтар каля 150 навуковых і навукова-папулярных публікацый. Адзін з аўтараў манаграфій "Рижский мир в судьбе белорусского народа" (Минск, 2014), "История белорусской государственности" (Т. 3. Минск, 2018). Рэдактар пяці зборнікаў дакументаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху і гісторыі Праваслаўнай царквы.*



# Сяргей Паўловіч (1875—1940):

## *старонкі жыцця і дзейнасці*

**У міжваеннае дваццацігоддзе беларусы, якія пражывалі ў Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы, зведалі моцны цяжар палітыкі асіміляцыі і дэнацыяналізацыі. Штогод польская адміністрацыя падаўляла актыўнасць беларускіх арганізацый, закрывала нацыянальныя школы, канфіскоўвала кнігі і газеты на беларускай мове. У такіх складаных умовах беларусы абаранялі сваю годнасць. На жаль, шмат хто з гэтых удзельнікаў нацыянальнага руху цяпер забыты, а іх уклад у агульнабеларускую культурную скарбонку малавядомы суайчыннікам. Адным з такіх дзеячаў быў Сяргей Паўловіч — таленавіты педагог, асветнік, царкоўны дзеяч і публіцыст.**



*Сяргей Паўловіч. 1920-я гг.*
*Крыніца: БДАМЛІМ.*

**Ключавыя словы:** *Сяргей Паўловіч, Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, беларускі нацыянальны рух, нацыянальныя рухі*

Калі ў міжваеннай Заходняй Беларусі асоба Сяргея Паўловіча была вядомая многім актывістам беларускага нацыянальнага руху, то пасля яго смерці ў 1940 г. дзейнасць і ўклад гэтага чалавека ў айчынную культуры былі на некаторы час забытыя. У пасляваенны перыяд у савецкай беларускай гістарыяграфіі імя Паўловіча фактычна не згадвалі ў акадэмічных выданнях, прысвечаных гісторыі Заходняй Беларусі. Толькі эпізадычныя згадкі аб ім маюцца ва ўспамінах некаторых былых дзеячаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) [1, с. 96, 100, 360]. Тым не менш у 1968 г. у выданні *"Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі Беларусі"* даследчыца Г.Сянькевіч, аналізуючы развіццё педагогікі ў міжваеннай Заходняй Беларусі, прысвяціла некалькі абзацаў працам С.Паўловіча, якога ахарактарызавала як *"прагрэсіўнага педагога"* [2].

У савецкія часы асобу Паўловіча як дасведчанага педагога і беларускага асветніка станоўча ўзгадваў Максім Танк у дзённікавых запісах *"Лісткі календара"*. Паэт у другой палове 1930-х гг. у Вільні часта кантактаваў з Паўловічам па лініі Таварыства беларускай школы (ТБШ) (а таксама з рэдакцыяй некалькіх беларускіх перыядычных выданняў), заходзіў да яго на гарбату і паразмаўляць пра культурна-асветніцкія справы [3, с. 105, 137, 161]. Аднак ані Танк, ані Рыгор Шырма, з кім Паўловіч таксама быў у блізкіх стасунках у міжваенны перыяд, ані іншыя былыя актывісты КПЗБ у савецкі час не падрыхтавалі ўспамінаў ці навукова-папулярных публікацый пра гэтага дзеяча. Напэўна, адной з прычын такога замоўчвання была царкоўна-рэлігійная частка яго біяграфіі.

У 1986 г. беларускі даследчык і біёграф А.Ліс адмыслова для выдання *"Антология педагогической мысли Белорусской ССР"* падрыхтаваў кароткі нарыс біяграфіі беларускага дзеяча, зрабіўшы акцэнт на яго педагагічным унёску [4, с. 360—362]. Можна меркаваць, што аўтар выкарыстоўваў для сваёй працы матэрыялы, атрыманыя ад удавы Паўловіча [5].



pawet.net



*Сяргей Паўловіч (у другім шэрагу другі злева) сярод выкладчыкаў Віленскай беларускай гімназіі. 1920-я гг. Крыніца: ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі.*

У часы незалежнай Беларусі біяграфія С.Паўловіча стала аб'ектам даследавання шэрагу гісторыкаў і публіцыстаў, якія раскрылі раней невядомыя аспекты яго дзейнасці, у тым ліку яго ўнёсак у развіццё праваслаўнага асветніцтва ў міжваеннай Заходняй Беларусі [6—11]. Імя С.Паўловіча пачало згадвацца ў мартыралогах царкоўных дзеячаў, што на сённяшні час стварае падставы для яго ўшанавання ў Беларускай праваслаўнай царкве [12, с. 152—153; 13, с. 64—65].

Разам з тым нераскрытымі засталіся многія пытанні, звязаныя з біяграфіяй Паўловіча, напрыклад, яго ўзаемаадносіны з іншымі вядомымі прадстаўнікамі беларускай культуры, яго грамадская і палітычная дзейнасць у якасці аднаго з лідараў ТБШ, уплыў яго педагагічных прац на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Па-ранейшаму невядомым з'яўляецца лёс рукапіснай спадчыны С.Паўловіча і яго асабістага архіва, што можа афарміцца ў накірунак для развіцця далейшых даследаванняў. Важнай вехай у аднаўленні памяці аб гэтым дзеячы паслужыла своеасаблівае "адкрыццё" аўтарам артыкула ў 2014 г. на віленскіх Еўфрасіннеўскіх могілках пахавання Паўловіча і яго жонкі, што дало магчымасць Беларускаму праваслаўнаму брацтву ў гонар Віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія ў г. Мінску і прадстаўнікам беларускай дыяспары аднавіць магілу і ўсталяваць надмагільны помнік [14].

❖❖❖

Сяргей Канстанцінавіч Паўловіч нарадзіўся 13 верасня (25 верасня па новым стылі) 1875 г. у в. Осаўцы (Восаўцы) Кобрынскага павета (цяпер Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці). Яго бацька, святар Канстанцін Паўловіч, паходзіў з духоўнага саслоўя, быў сынам уніяцкага святара Іосіфа Паўловіча, які пасля скасавання уніі перайшоў у Праваслаўную царкву і служыў у в. Пажэжын (цяпер Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці). Айцец Канстанцін пасля сканчэння Літоўскай духоўнай семінарыі некаторы час працаваў наглядчыкам у Жыровіцкім духоўным вучылішчы, пасля служыў у прыходах у тагачаснай Гродзенскай губерні, быў іванаўскім благачынным. Апошнім месцам яго служэння быў г. Ваўкавыск, дзе ён памёр у 1900 г.

Сяргей скончыў Літоўскую духоўную семінарыю ў Вільні, затым у 1899 г. Кіеўскую духоўную акадэмію, дзе атрымаў ступень кандыдата багаслоўя за працу *"Замойскі ўніяцкі сабор 1720 года"* (захоўваецца ў Інстытуце рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У.Вернадскага).

Пасля заканчэння духоўнай акадэміі С.Паўловіч не прыняў святарскага сану і выбраў шлях педагога. Яго прызначаюць настаўнікам духоўнага вучылішча ў г. Каргапаль Аланецкай губерні (цяпер Архангельская вобласць Расіі) [16, с. 438]. Увосень 1903 г. ён вярнуўся ў Беларусь і пачаў выкладаць у Жыровіцкім духоўным вучылішчы. У 1904 г. у Гродна пабачыла свет манаграфія С.Паўловіча, прысвечаная Замойскаму сабору. Яе выданне далучыла аўтара да мясцовых даследчыкаў гісторыі Праваслаўнай царквы, такіх як Р.Кіпрыяновіч, Л.Паеўскі, М.Дзікоўскі і інш. У той жа час Паўловіч працягваў працаваць настаўнікам. З 1909 па 1912 г. ён выкладаў Закон Божы ў Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі і жаночай гімназіі.

У 1913 г. Паўловіч вяртаецца ў Гродзенскую губерню і ўладкоўваецца інспектарам народных школ Ваўкавыскага павета, удзельнічае ў працы павятовага аддзела Гродзенскага савета епархіяльных вучылішчаў [13, с. 64]. У 1915 г. пад час Першай сусветнай вайны ён апынуўся ў Калужскай губерні, адкуль вярнуўся ў Заходнюю Беларусь, занятую польскімі войскамі, у 1921 г. З гэтага часу яго лёс быў звязаны з Вільняй, дзе таленавіты педагог пражыў да свайго скону і зрабіў значны ўнёсак у развіццё беларускай культуры.

❖❖❖

Можна меркаваць, што пасля вяртання С.Паўловіча з бежанства ў Вільню і да 1925 г. ён не меў дачынення да беларускага нацыянальнага руху. Напрыклад, яго постаці няма на фотаздымку ўдзельнікаў з'езда беларускіх настаўнікаў сярэдніх школ Заходняй Беларусі, які адбыўся ў Вільні ў красавіку 1923 г. У сярэдзіне 1920-х гг. беларускія арганізацыі разгарнулі моцныя кампаніі па арганізацыі асветніцтва на род-



*Сяргей Паўловіч (першы ў другім радзе злева) сярод беларускіх настаўнікаў на настаўніцкіх курсах у Радашковічах, 1927 г. Крыніца: ЦНБ НАН Беларусі.*

най мове, адкрыцці нацыянальных пачатковых і сярэдніх школ. У Заходняй Беларусі пачалі дзейнічаць беларускія гімназіі ў Вільні, Радашковічах, Клецку і Навагрудку, арганізоўваліся настаўніцкія курсы, выдаваліся беларускія падручнікі і г. д. Напрыклад, актывістамі ў 1925 г. было сабрана больш за 6 000 дэкларацый за адкрыццё беларускіх пачатковых школ, што адлюстроўвала жаданне пераважна сельскага насельніцтва вучыць дзяцей па-беларуску [17, с. 38].

З дакументальных крыніц вядома, што ў лютым 1925 г. С.Паўловіч пачаў рабіць захады, каб уладкавацца выкладчыкам беларускай мовы ў Віленскую духоўную праваслаўную семінарыю. У прашэнні ён адзначаў наступнае: *"Я па паходжанні беларус, і хаця раней не выкладаў гэты прадмет* (беларускую мову. — **Аўт.**), *але змагу за кароткі час, у выніку актыўных заняткаў, авалодаць беларускай літаратурнай і гутарковай мовай"* [18, арк. 72]. Напэўна, гэтыя спробы стаць выкладчыкам беларускай мовы з'яўляліся першым крокам фактычна ўжо 50-гадовага педагога да беларускай нацыянальнай дзейнасці. На жаль, у семінарыю Паўловіча не прынялі, бо, напэўна, яго кандыдатура не была зацверджана польскімі школьнымі ўладамі [18, арк. 76]. Аднак побач з духоўнай семінарыяй у Вільні ў міжваенны перыяд працавала беларуская гімназія, куды С.Паўловіча ў 1925 г. прынялі выкладчыкам Закона Божага. У гімназіі ён адпрацаваў тры гады, некаторы час выконваючы абавязкі дырэктара.

З 1925 г. імя Сяргея Паўловіча пачало згадвацца ў кіруючых структурах беларускіх нацыянальных арганізацый. У гэты час ён увайшоў у склад сяброў Беларускага навуковага таварыства ў Вільні, якое аб'ядноўвала вядомых прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі і апекавалася Беларускім музеем імя І.Луцкевіча [19, с. 439]. У лістападзе 1925 г. С.Паўловіч быў прыняты ў склад кіраўніцтва Цэнтральнай беларускай школьнай рады, якая займалася арганізацыяй беларускага школьніцтва і падрыхтоўкай нацыянальна арыентаваных кадраў настаўнікаў [20]. Акрамя гэтага, у розныя часы ён працаваў у такіх нацыянальных арганізацыях, як Беларускае выдавецкае таварыства, Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, Беларускі кааператыўны банк і нават віленскі беларускі кааператыў "Раніца" [21—23]. Той факт, што за такі кароткі тэрмін чалавек, які толькі нядаўна далучыўся да беларускага руху, увайшоў у кіруючыя органы розных нацыянальных структур, яскрава адлюстроўвае яго працаздольнасць і аўтарытэт.

У міжваенны перыяд С.Паўловіча можна было сустрэць на розных культурных і асветніцкіх мерапрыемствах, што праводзілі беларускія арганізацыі ў Заходняй Беларусі. Так, ён згадваўся сярод удзельнікаў святкавання 20-годдзя беларускай прэсы, арганізаваным у верасні 1926 г. у Вільні [24, с. 276]. У 1932 г. Паўловіч увайшоў у склад юбілейнага камітэта па святкаванні 50-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа, куды таксама ўваходзілі такія вядомыя дзеячы, як Рыгор Шырма, Адам Станкевіч, Вячаслаў Багдановіч, Аляксандр Уласаў. 27 лістапада 1932 г. камітэтам быў арганізаваны ўрачысты вечар, дзе гучалі даклады аб творчасці беларускіх паэтаў, чыталіся іх вершы, выступаў студэнцкі хор пад кіраўніцтвам Р.Шырмы [25, с. 3].

У 1933 г. С.Паўловіч абраны старшынёй юбілейнага камітэта па святкаванні 15-й гадавіны незалежнасці Беларусі, дзе побач з ім працавала шмат маладых людзей з новай генерацыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі [26]. Таксама ён удзельнічаў у рабоце дыскусійных пляцовак, дзе абмяркоўваліся пытанні развіцця беларускай культуры. Напрыклад, у кастрычніку 1933 г. у Вільні адбылася лекцыя вядомага філолага Янкі Станкевіча, прысвечаная рэформе правапісу беларускай мовы ў БССР. Пасля лекцыі адбылася дыскусія паміж прадстаўнікамі віленскай беларускай інтэлігенцыі, пад час якой С.Паўловіч выступіў у абарону рэфармаванага правапісу [27].

Актыўная дзейнасць на карысць беларускай культуры прадвызначала разнастайныя сувязі С.Паўловіча з нацыянальнай інтэлігенцыяй. Як ужо адзначалася вышэй, з ім цесна супрацоўнічалі паэт Максім Танк, кампазітар Рыгор Шырма. Падручнікі, якія рыхтаваліся педагогам, упрыгожвала графіка вядомых заходнебеларускіх мастакоў, такіх як Мікалай Васілеўскі і Язэп Драздовіч. Перапіска з апошнім, між іншым, захавалася да нашага часу. З яе мы даведаліся, што Паўловіч у канцы 1920-х гг. меў кантакты і з Беларускай акадэміяй навук у Мінску, адкуль атрымліваў навуковую літаратуру. Менавіта дзякуючы яго пасярэдніцтву Драздовіч у гэты перыяд перадаў у акадэмію некалькі альбомаў сваіх фальклорных запісаў гэтай пары [28, арк. 10].




*Вокладка брашуры С.Паўловіча "Аб арганізацыі Беларускае працоўнае школы". 1928 г.*




*Вокладка выдання С.Паўловіча "Праваслаўны малітваслоў на царкоўна-славянскай і беларускай мове". 1933 г.*

*Вокладка кнігі С.Паўловіча "Пішы самадзейна. Развіваццё навыку самастойнага пісьма". 1929 г.*




*Вокладка кнігі С.Паўловіча "Сьвяшчэнная гісторыя Новага Завету". 1936 г.*




Важным унёскам С.Паўловіча ў скарбонку беларускай культуры былі падручнікі для хатняга навучання і навучання Закону Божаму, падрыхтаваныя на працягу 1920—1930-х гг. У прыватнасці, ён быў аўтарам наступных падручнікаў: *"Сьвяшчэнная гісторыя Старога Завету"*, *"Пішы самадзейна. Разьвіцьцё навыку самастойнага пісьма"*, *"Метадычныя ўвагі да пасобніка "Пішы самадзейна"*, *"Сьвяшчэнная гісторыя Старога Завету"*, *"Беларуска-славянскі лемантар і першая навука Закона Божага"*, *"Першыя зярняткі"*, *"Засеўкі"*. С.Паўловіч распрацоўваў дыдактычныя заданні з апорай на беларускі матэрыял, устаўляў тэксты і малюнкі з нацыянальнай тэматыкай.

❖❖❖

У 1920—1930-я гг. прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі ў Заходняй Беларусі актыўна пашыралі беларускую мову, культуру і такім чынам фарміравалі свядомасць беларусаў з мэтай супрацьстаяння паланізацыі. Увага звярталася на развіццё сеткі беларускіх школ у заходнебеларускіх ваяводствах. Гэтай справай актыўна займалася арганізацыя культурна-асветніцкага характару — Таварыства беларускай



*Сяргей Паўловіч (у цэнтры) сярод удзельнікаў акруговага схода ТБШ у Міры. 1929 г. Крыніца: БДАМЛіМ.*

школы (ТБШ), утворанае ў Вільні ў 1921 г. З сярэдзіны 1920-х гг. і фактычна да закрыцця арганізацыі ў 1936 г. актыўны ўдзел у яе працы прымаў С.Паўловіч. Ён увайходзіў у склад Галоўнай управы ТБШ, займаўся распрацоўкай падручнікаў для хатняга навучання і выкладання Закона Божага ў школах. Постаць Паўловіча можна заўважыць на шматлікіх фотаздымках мерапрыемстваў ТБШ.

У рамках дзейнасці ТБШ С.Паўловіч займаўся рэдактарскай працай, укладаў часопісы *"Родныя гоні"*, *"Летапіс ТБШ"*, *"Беларускі летапіс"*. Ім быў складзены *"Беларускі каляндар на 1929 год"*, дзе змяшчаліся звесткі пра тагачаснае грамадскае і культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі. У выданнях друкаваліся нарысы Паўловіча, прысвечаныя развіццю адукацыі і асветніцтва. У адным з нарысаў *"Шляхам асветы"* аўтар, разумеючы ўвесь цяжар паланізацыі, аптымістычна заклікаў беларусаў верыць у свае нацыянальныя сілы: *"Аднак "не загінуў край наш родны", і Беларусь паволі пачынае абуджацца ад векавога сну, знаходзіць самую сябе, узбагачаць свой культурны скарб, больш і больш замацоўваць "наперекор стихиям" свае правы на лепшае жыццё… Ад веку мы сядзім на сваёй зямлі, на якой беларус гаспадарыў ад часоў Рагвалода і Усяслава, Гедыміна і Альгерда, якая так паліта потам і крывёй беларуса, якая на кожным кроку носіць знакі яго мазольнае працы… Мы маем свой вякамі створаны быт, сваё нацыянальнае аблічча, сваю асаблівую культуру — культуры працы, заняткаў — сваю думку, сваю душу, сваю вялікую чароўную песню, сваю гісторыю. Напаследак, і гэта найважнейшае, мы маем сваю мову, сваё роднае, безсмяротнае слова"* [29, с. 17—18].

Дзейнасць ТБШ выклікала негатыўную рэакцыю з боку ўладаў, якія бачылі пагрозу інтарэсам Польшчы ў Заходняй Беларусі. Актывісты арганізацыі знаходзіліся пад пільным наглядам паліцыі, а барацьба за пашырэнне беларускіх школ сустракала супрацьдзеянне школьных уладаў. А левардыкальныя групы, і ў першую чаргу камуністы, разлічвалі выкарыстаць арганізацыйны патэнцыял ТБШ у палітычных мэтах і таму спрабавалі ўвайсці ў склад кіраўніцтва арганізацыі, тым самым ускладнялі яе легальную працу. Гэтыя акалічнасці перадвызначылі тое, што нярэдка лідары ТБШ і яго актыўныя дзеячы падвяргаліся пераследам з боку ўладаў і арыштоўваліся па падазрэннях у антыдзяржаўнай дзейнасці.

Адной з такіх акцый польскіх уладаў была так званая справа ТБШ, якая разгарнулася ў Заходняй Беларусі з 1930 па 1933 г. Паводле дакументальных крыніц, 16 кастрычніка 1930 г. у Вільні адбыліся масавыя затрыманні чальцоў таварыства. Было затрымана 14 чалавек, у тым ліку

як вядомыя дзеячы беларускай культуры, так і маладыя актывісты, напрыклад, Фелікс Стэцкевіч, Рыгор Шырма, Сяргей Паўловіч, Барыс Кіт, Герман Вялецкі, Міхаіл Пяткевіч, Марыя Скурко і інш. [30, арк. 3]. Іх абвінавацілі па артыкуле 102 Крымінальнага кодэкса ў сувязях з камуністамі і падрыўной дзейнасці, за што ім пагражаў тэрмін да 8 гадоў турмы [31]. Затрыманых змясцілі ў віленскую вязніцу Лукішкі для далейшага следства.

У Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы намі выяўлены дакумент, які пацвярджае, што С.Паўловіч быў вязнем Лукішскай турмы два месяцы. Гэта ўласнаручны ліст Паўловіча, напісаны ім у камеры 257 другога корпуса турмы і адрасаваны Віленскаму акруговаму суду з просьбай аб змене меры ўтрымання. Прыводзім гэты дакумент цалкам у перакладзе з польскай мовы.

*Акт № 1440/30*
*Вязень палітычны, частка 2 арт. 102 К[рымінальнага] К[одэксу]*
*Паўловіч Сяргей*
*Корпус ІІ*
*Камера № 257*

*У Віленскі акруговы суд*

*16.X.1930 г. я быў арыштаваны органамі бяспекі і па рашэнні п[ана] следчага IV акругі Вільні 18.X.1930 г. адносна мяне быў ужыты, як папярэдняя мера, часовы арышт тэрмінам на 2 месяцы да 16.XII.1930 г.*

*У сувязі з тым, што я не адчуваю за сабой ніякай віны, а маё знаходжанне ў вязніцы пазбавіць маіх родных усялякіх сродкаў для жыцця — ласкава прашу Акруговы суд аб змене меры стрымання.*

*Сяргей Паўловіч [32, арк. 2—2 адв.]*

Следчыя органы не задаволілі просьбу Паўловіча — 4 лістапада 1930 г. Віленскі акруговы суд пакінуў часовы тэрмін зняволення без зменаў [32, арк. 4 адв.]. На жаль, следчая справа Паўловіча, у якой былі выяўлены гэтыя сведчанні, утрымлівае ўсяго некалькі дакументаў і не дазваляе адсачыць далейшае развіццё падзей. Вядома толькі, што Паўловіч адседзеў у турме на Лукішках увесь 2-месячны тэрмін зняволення і ў канцы снежня 1930 г. быў вызвалены, знаходзячыся пры гэтым пад следствам да канца судовага разбіральніцтва [33].

У той жа час згодна з дакументамі агульнай следчай справы на актывістаў ТБШ, якая таксама захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, можна сцвярджаць, што Паўловіч затрымліваўся польскай паліцыяй прынамсі яшчэ адзін раз. 5 лютага 1931 г. на мяжы Вольнага горада Гданьска і Польшчы быў арыштаваны вядомы беларускі дзеяч Браніслаў Тарашкевіч, у партфелі якога былі знойдзены дакументы аб перадачы камуністамі фінансавых сродкаў актывістам ТБШ. З гэтай нагоды дзеячы таварыства, якія ўжо знаходзіліся на свабодзе, у тым ліку С.Паўловіч, 13 лютага 1931 г. зноў былі затрыманыя, у іх кватэрах праведзеныператрусы [30, арк. 35]. На жаль, у следчай справе няма звестак, на які тэрмін Паўловіч быў затрыманы зноў, аднак вядома, што 15 лютага ён знаходзіўся пад арыштам [30, арк. 35 адв.]. Імаверна, праз некаторы час яго таксама вызвалілі да суда, магчыма, пасля выплаты грашовага задатку. Судовага працэсу над Паўловічам не адбылося.

У справе ТБШ маецца пастанова следчага Ю.Булгака, паводле якой у канцы лютага 1932 г. следчыя дзеянні адносна С.Паўловіча, М.Марцінчыка, Б.Кіта, М.Скурко, І.Біндзюка і шэрагу іншых актывістаў былі спыненыя па прычыне адсутнасці доказаў іх кантактаў з камуністычным падполлем [30, арк. 165]. Частка дзеячаў ТБШ, у першую чаргу чальцы Галоўнай управы Ф.Стэцкевіч, Р.Шырма і М.Пяткевіч, якія з'явіліся ў судзе ў 1933 г., былі цалкам апраўданыя [34].

❖❖❖

Новая хваля рэпрэсій польскіх уладаў адносна С.Паўловіча прыпала на 1936 г. У гэты час ТБШ рабіла спробы аднавіць сваю актыўнасць і разам з Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры імкнулася правесці шырокую акцыю па адкрыцці беларускіх школ у Заходняй Беларусі. Узнаўленне дзейнасці арганізацыі адбывалася ў вельмі няпростых перыяд. У канцы 1930-х гг. у Польшчы назіралася ўзмацненне палітыкі нацыянальнай асіміляцыі няпольскіх меншасцяў, якое суправаджалася закрыццём шэрагу арганізацый, праследам нацыянальных актывістаў, паланізацыяй Праваслаўнай царквы. Таму невыпадкова дзейнасць ТБШ зноў прыцягнула ўвагу з боку польскіх спецслужбаў. Унутры арганізацыі ў гэты час дзейнічаў канфідэнт спецслужбаў пад мянушкай Гаеўскі, які паведамляў уладам пра кожнае рашэнне Галоўнай управы ТБШ. У яго данясеннях занатавана: *"20 мая 1936 г. Ян Шутовіч, Сяргей Паўловіч, Рыгор Шырма скпікалі членаў* (Таварыства беларускай школы і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. — **Аўт.**) *з мэтай абмеркавання беларускіх спраў і новых арганізацыйных пастаноў. Між іншым, на сходзе падкрэслівалася, што трэба ў далейшым выкарыстаць момант для пашырэння беларускага школьніцтва. Ад ТБШ найбольш у гэтым кірунку працуюць Сяргей Паўловіч і Рыгор Шырма"* [35, арк. 23].

Асцерагаючыся актывізацыі дзейнасці беларускіх арганізацый, улады зрабілі ўласныя контрзахады. У лістападзе 1936 г. у Вільні пракацілася хваля ператрусаў сярод актыўных беларускіх дзеячаў. Польская паліцыя шукала кампраметуючыя матэрыялы савецкага паходжання. Вобыскі адбыліся ў ксяндза А.Станкевіча, Я.Найдзюка, А.Клімовіча і інш. 28 лістапада 1936 г. а 10.30 раніцы паліцыя правяла ператрус у С.Паўловіча. У пратаколе адзначана: *"Было знойдзена: 1) Дванаццаць асабістых лістоў ад сястры, бацькі жонкі і інш.; 2) перапіска з Мітраполіяй і Сіно-*

*дам; 3) матэрыялы і лісты да школьнага сакратарыяту; 4) матэрыялы камісіі рэлігійных падручнікаў; 5) матэрыялы для дзіцячай чытанкі. Названыя матэрыялы і лісты былі знойдзены ў шуфлядах стала. Пры вобыску прысутнічаў Сяргей Паўловіч, які не выказаў да працэдуры вобыску ніякіх прэтэнзій*" [36, арк. 23]. Антыдзяржаўных матэрыялаў ці камуністычнай літаратуры ў Паўловіча не выяўлена, а сам вобыск меў хутчэй прэвентыўны характар.

❖❖❖

Адной з апошніх спраў С.Паўловіча ў дзейнасці Таварыства беларускай школы стала падрыхтоўка сумеснага мемарыяла ТБШ і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК), адрасаванага варшаўскаму мітрапаліту Дыянісію. Мемарыял быў пададзены польскім царкоўным уладам у лістападзе 1936 г., амаль за месяц да закрыцця ТБШ уладамі. Актыўна развіваючы беларускую школьную акцыю, С.Паўловіч звярнуў увагу на праблему вывучэння Закона Божага ў школах Заходняй Беларусі на роднай мове. Трэба заўважыць, што такі прадмет быў фактычна апошнім "фарпостам" захавання нацыянальнай і канфесійнай ідэнтычнасці беларускіх дзяцей ва ўмовах татальнай паланізацыі адукацыі ў Заходяй Беларусі. Аднак паступова і гэты прадмет пераводзіўся на польскую мову, што стварыла неабходнасць узняць гэтае пытанне на вышэйшым царкоўным узроўні. Таму ў мемарыяле С.Паўловіч між іншым падкрэсліваў, што ім быў падрыхтаваны шэраг падручнікаў і малітасловаў на беларускай мове, якія можна выкарыстоўваць на занятках па Законе Божым. "*Толькі пры ўжыванні роднай мовы дзяцей царкоўна-рэлігійнае ўзгадванне іх як у школе, так і па-за школаю будзе ісці нармальным шляхам*", — адзначалася ў дакуменце [37, с. 1]. У канцы мемарыяла змяшчаліся прапановы па пашырэнні беларускай мовы ў царкоўнай сферы, напрыклад, карыстацца на ўроках Закона Божага ў школах з беларускімі дзецьмі выключна беларускай і царкоўнаславянскай мовамі, пашыраць ужыванне роднай мовы ў пропаведзях праваслаўных святароў, пачаць выданне ў Вільні беларускага царкоўнага часопіса [37, с. 2].

Можна меркаваць, што ў атачэнні варшаўскага мітрапаліта дадзены мемарыял выклікаў пэўную зацікаўленасць. 2 снежня 1936 г. С.Паўловіч разам з прадстаўнікамі БІГіК Станіславам Грынкевічам і Міколам Дварэцкім сустрэўся з мітрапалітам у Варшаве, яны агучылі выстаўленыя вышэй патрабаванні. У сакавіку 1937 г. адбыўся другі візіт беларускіх дзеячаў С.Паўловіча, ксяндза Адама Станкевіча і Адольфа Клімовіча да кіраўніка Польскай праваслаўнай царквы. Вынікам гэтых сустрэч стаў дазвол на выданне ў якасці штомесячнага дадатку да рускамоўнай газеты мітраполіі "*Слова*" дзіцячага часопіса "*Снапок*" на беларускай мове [38, с. 82]. 1 мая 1937 г. у Варшаве выйшаў першы нумар гэтага выдання.

Часопіс "*Снапок*", які ўкладаў і рэдагаваў С.Паўловіч, быў значным культурна-асветніцкім праектам для дзяцей на роднай мове. У ім друкаваліся артыкулы пра вядомых праваслаўных асветнікаў і святых (Кірыл і Мяфодзій, тры віленскія пакутнікі і інш.), выявы архітэктурных помнікаў Беларусі, змяшчаліся творы беларускіх пісьменнікаў, народныя песні, казкі, прымаўкі, загадкі [9, с. 386]. Фактычна гэты часопіс павінен быў адыгрываць ролю своеасаблівага падручніка для хатняга навучання роднай мове і культуры, якога так не хапала беларускім дзецям, што вучыліся ў польскамоўным асяроддзі. Нездарма адразу пасля выхаду "*Снапок*" прыцягнуў пільную ўвагу польскіх чыноўнікаў. Так, ужо ў чэрвені 1937 г. кіраўнік аддзела па нацыянальных справах Міністэрства ўнутраных спраў у лісце да дэпартамента веравызнанняў Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы заклікаў прыняць адпаведныя меры дзеля спынення фінансавай падтрымкі гэтай выдавецкай ініцыятывы з боку мітраполіі, бо яна накіравана на барацьбу з польскай мовай у царкоўным жыцці [38, с. 82].

Каб захаваць часопіс ад пераследу з боку свецкіх уладаў, у мітраполіі (ці асобнымі супрацоўнікамі мітраполіі, магчыма, нават самім Паўловічам) былі здзейснены наступныя захады. "*Снапок*" быў дадаткам да газеты "*Слова*", і яго наўпрост не далучалі да тых нумароў газеты, якія абавязкова дасылаліся ў міністэрства. Гэта дало магчымасць бесперашкодна выдаць 10 нумароў часопіса. Аднак у лютым 1938 г. Віленскае ваяводскае ўпраўленне зразумела захады рэдакцыі, і 28 лютага 1938 г. Міністэрства ўнутраных спраў выдала загад аб забароне часопіса [38, с. 83].

Пераход польскай адміністрацыі да канчатковага вырашэння "беларускага пытання" шляхам асіміляцыі беларусаў яскрава засведчыў прыклад канфіскацыі аднаго з падручнікаў С.Паўловіча. У маі 1937 г. педагог выдаў дзіцячы лемантар для хатняга навучання "*Zasieŭki*", поўны наклад якога ўжо праз два тыдні быў канфіскаваны па распараджэнні віленскага гарадскога старосты [39]. Цікава, што на судзе Паўловіч праз адваката патрабаваў, каб пракурор выразна сфармуляваў прычыну канфіскацыі і прывёў дакладны тэкст лемантара, які, на думку ўладаў, з'яўляецца злачынным. Віленская пракуратура так і не змагла сфармуляваць сваё абвінавачанне, а судовая справа была адкладзена [40].

❖❖❖

Пастаянныя пераследы з боку польскіх уладаў, судовыя разбіральніцтвы, ператрусы падарвалі жыццёвыя сілы Сяргея Паўловіча. У лютым 1939 г. у лісце да ксяндза Уладзіслава Талочкі ён так апісваў стан свайго здароўя: "*Я адчуваю сябе вельмі неважна. На Калядах захварэў на грыпу. Ад таго часу да сёння трымаецца цяжкі бранхіт*" [41, арк. 2]. Ва ўмовах палітычных пертурбацый і адсутнасці нармальнага медыцынскага нагляду здароўе С.Паўловіча яшчэ больш пагоршылася. У маі 1940 г. ён пісаў да ксяндза Талочкі, што моцна хварэў на працягу чатырох месяцаў і фактычна не можа выйсці далей свайго дома [41, арк. 3]. 16 верасня

1940 г. С.Паўловіч памёр ад хваробы сэрца і пахаваны на Еўфрасінеўскіх могілках у Вільні. Яго жонка, Марыя Паўловіч, памерла ў 1977 г. і пахавана побач з мужам.

Напрыканцы заўважым, што ўнёсак Сяргея Канстанцінавіча Паўловіча ў беларускую культуру і захаванне нацыянальнай свядомасці вельмі значны і яшчэ не да канца асэнсаваны нашчадкамі. Ім былі падрыхтаваны па-беларуску чатыры падручнікі для хатняга навучання роднай мове, чатыры падручнікі па Законе Божым. Ва ўмовах адсутнасці якаснай беларускамоўнай адукацыі дзякуючы ім у дзяцей фарміравалася прыналежнасць да беларускага народа, канструявалася ўласная ідэнтычнасць. Падручнікі Сяргея Паўловіча з іх дыдактычным матэрыялам, малюнкамі, кароткімі апавяданнямі давалі магчымасць бацькам і дзецям разумець сябе як частку адзінага народа з багатай гісторыяй і традыцыямі. Яшчэ адным дасягненнем гэтага педагога і царкоўнага дзеяча стала выданне праваслаўнага малітваслова на беларускай мове ў 1933 г. Гэта было першае ў найноўшай гісторыі беларусаў адпаведнае выданне, зробленае з дазволу царкоўных уладаў.

1. Годы испытаний и мужества / Сост.: Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. — Минск : Беларусь, 1973. — 416 с.

2. Сянькевіч, Г. Р. Народная асвета ў Заходняй Беларусі / Г. Р. Сянькевіч // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Навук.-дасled. ін-т педагогікі М-ва асветы БССР. — Мінск, 1968. — С. 341—395.

3. Танк, М. Збор твораў. У 13 т. / М. Танк. — Мінск : Беларуская навука, 2009. — Т. 9. Лісткі календара. Дзённікі (1941—1959). — 592 с.

4. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э. К. Дорошевич, М. С. Мятельский, П. С. Солнцев. — Москва : Педагогика, 1986. — 468 с.

5. Сіцько, З. "Стары Паўловіч" / З. Сіцько // Наша слова. — 1992. — № 27. — С. 5.

6. Шырокава, М. Сяргей Паўловіч як асветнік і перакладчык (да 125-годдзя з дня нараджэння) / М. Шырокава // Праваслаўе. — 2000. — № 9. — С. 68—77.

7. Вабішчэвіч, А. Грамадская і навукова-педагагічная дзейнасць Сяргея Паўловіча / А. Вабішчэвіч // Праваслаўе. — 2007. — № 14—15. — С. 104—109.

8. Ільін, А. Радавод беларускага асветніка Сяргея Паўловіча / А. Ільін // Права-слаўе. — 2007. — № 14—15. — С. 110—111.

9. Чыгрын, С. Беларусы ў Варшаве ў першай палове XX стагоддзя / С. Чыгрын // "Мае Афіны тут — назваў іх Бандарамі" : profesorowi Aleksandrowi Barszczewskiemu na 80-lecie / redakcja naukowa: Mikołaj Timoszuk, Mikołaj Chaustowicz ; Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. — Warszawa, 2010. — S. 380—391.

10. Кулажанка, Л. Я. На ніве духоўнага асветніцтва / Л. Я. Кулажанка // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2011. — № 1. — С. 63—65.

11. Гардун, С. Сяргей Паўловіч як аўтар падручнікаў па біблейскай гісторыі / С. Гардун // Праваслаўе. 2015. — № 21. — С. 12—19.

12. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі 1917–1967 : энцыклапедычны даведнік у 2 т. / Л. Маракоў. — Мінск : Беларускі Экзархат, 2007. — Т. 2. — С. 152 — 153.

13. Горны, А. С. Сінодзік пацярпелых за веру і Царкву Хрыстовую ў Гродзенскай епархіі / А. С. Горны. — Гродна : Юрсапрынт, 2014. — С. 64—65.

14. Супрацоўніцтва з Таварыствам беларускай культуры ў Літве. — URL: http://sppsobor.by/life/news/news-vilna/13088 (дата звароту: 20.08.2025).

15. Священник Константин Павлович (некролог) // Литовские епархиальные ведомости. — 1900. — № 36. — С. 328—329.

16. Биографический словарь выпускников Киевской духовной академии: 1819—1920-е гг. : Материалы из собрания проф. протоиерея Ф. И. Титова и архива КДА : в 4 т. / [сост. В. И. Ульяновский]. — Киев : Издательский отдел Украинской Православной Церкви, 2015. — Т. 2 : К—П. — 624 с.

17. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. — Брэст : БрДУ, 2008. — 319 с.

18. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). — F. 220. Ap. 1. B. 322.

19. Луцкевіч, А. Барацьба за вызваленьне / А. Луцкевіч. — Беласток; Вільня : Беларускае гістарычнае таварыства, Інстытут беларусістыкі, 2009. — 649 с.

20. Хроніка // Беларуская ніва. — 1925. — № 1. — С. 4.

21. Хроніка // Права працы. — 1927. — № 2. — С. 4.

22. Наша хроніка // Думка працы. — 1928. — № 1. — С. 5.

23. Хроніка // Шлях моладзі. — 1933. — № 9. — С. 15.

24. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. — Мінск : Логвінаў, 2009. — 396 с.

25. Я-к. Сьвяткаваньне Юбілею Я. Купалы і Я. Коласа / Я-к // Шлях моладзі. — 1932. — № 12. — С. 3—4.

26. Хроніка. З беларускага жыцьця // Шлях моладзі. — 1933. — № 3. — С. 16.

27. З Беларускага жыцьця // Родны край. — 1933. — № 22. — С. 4.

28. Цэнтр даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі. — Ф. 2. Воп. 1. Спр. 53.

29. Паляшук. Шляхам асветы / Паляшук // Летапіс Таварыства Беларускай Школы. — 1936. — № 1—3. — С. 15—22.

30. LCVA. — F. 131. Ap. 2. B. 1281.

31. Areszty wśród wywrotowców w Wilnie // Słowo. — 1930. — Nr 239. — S. 3.

32. LCVA. — F. 129. Ap. 2. B. 4303.

33. З Беларускага жыцьця пад Польшчай // Беларуская крыніца. — 1931. — № 1. — С. 1.

34. Biełaruskaje žyćcio za 1933 hod // Biełaruskaja krynica. — 1934. — № 1. — S. 3.

35. LCVA. — F. 51. Ap. 17. B. 530.

36. LCVA. — F. 131. Ap. 2. B. 3528.

37. З царкоўнага пагосту. Мэмарыял // Беларуская крыніца. — 1936. — № 45. — С. 1—2.

38. Давідзюк, Мікола. Справа беларусізацыі праваслаўнай царквы ў святле палітыкі польскіх дзяржаўных улад 1919—1939 / Мікола Давідзюк // Беларускі каляндар на 1990 год. Беласток : БГКТ, 1990. — С. 67—92.

39. Хроніка. З беларускага жыцьця // Шлях моладзі. — 1937. — № 6. — С. 22.

40. Хроніка. З беларускага жыцьця // Шлях моладзі. — 1937. — № 14. — С. 14.

41. Lietuvos Mokslų Akademijos Vrublevskių Biblioteka. Rankraščių skyrius. — F. 21. B. 680.

*Паступіў у рэдакцыю 21.07.2025.*